# КНІГА «НАРАЧАНКА І ЯЕ БЕРАГІ»: УНІВЕРСАЛЬНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ РЭГІЁНА

## У дапамогу арганізатару краязнаўчай работы

**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,
доктар культуралогіі, прафесар



**Гісторыя беларускага народа, яго культуры даследуецца шэрагам сацыяльна-гуманітарных навук. Каштоўнай крыніцай ведаў аб культурна-гістарычных асаблівасцях асобных рэгіёнаў Беларусі, іх населеных пунктаў з'яўляюцца краязнаўчыя працы. Важныя звесткі аб духоўнай і матэрыяльнай культуры пэўных мясцовасцей нашай краіны ўтрымліваюцца ў даследаваннях А. Я. Багдановіча, А. К. Ельскага, К. А. Гаворскага, З. Я. Даленгі-Хадакоўскага, А. Г. Кіркора, К. П. Тышкевіча і інш.**

Рознабаковасцю і грунтоўнасцю вызначаюцца таксама працы многіх сучасных краязнаўцаў. Адна з іх – кніга «Нарачанка і яе берагі» [4]. Яе аўтары – апантаныя беларускія краязнаўцы Сымон Вікенцьевіч Барыс і Анатоль Валянцінавіч Рогач. На іх рахунку шмат публіцыстычных артыкулаў, прысвечаных культурным адметнасцям Вілейшчыны і Мядзельшчыны. Намаганнямі А. В. Рогача, па прафесіі інжынера-электрыка, у Вілейскім раёне ўстаноўлена 20 помнікаў і памятных знакаў, у тым ліку Мемарыял памяці былых вёсак раёна. С. В. Барыс – вядомы фалькларыст, пісьменнік, журналіст, аўтар 10 кніг. Абодвух аб'яднала любоў да сваёй малой радзімы, старажытнай і прыгожай Нарачанскай зямлі. І вельмі шкада, што Анатоль Рогач не паспеў убачыць вынікаў сумеснай з аднадумцам-земляком трыццацігадовай працы.

За такі працяглы адрэзак часу апантаныя саўтары пешшу, на лодках, веласіпедах, калі-нікалі на чыімсьці аўтамабілі (уласных у аўтараў не было) пабывалі ва ўсіх населеных пунктах, раскіданых па 75-кіламетровай прасторы ракі Нарачанка і яе 17 невялікіх прытокаў, па берагах самага вялікага ў нашай краіне возера Нарач. Краязнаўцы-аматары вывучылі шмат дакументаў у архівах Вільні, Гродна, Маладзечна, Мінска, прааналізавалі сотні манаграфічных прац у бібліятэках Беларусі, апыталі і запісалі аповеды дзясяткаў жыхароў Нарачанскага краю. У выніку на старонках кнігі ўмела спалучаны навукова-гістарычны і сучасны грамадска-палітычны, этнаграфічны і побытавы матэрыял.

Галоўная адметнасць ажыццёўленай працы – комплексны падыход да вывучэння Нарачанскага краю. Тут утрымліваюцца падрабязныя звесткі па фізічнай і эканамічнай геаграфіі Вілейска-Нарачанскага краю. Аўтары грунтоўна і з любоўю распавядаюць пра адметнасці Нарачана-Вілейскай нізіны, яе рэкі, азёры, пагоркі, лясы, раслінны і жывёльны свет, прыродныя багацці. Звяртае на сябе ўвагу цікавае тлумачэнне старадаўніх тапонімаў. Так, назву ракі Нарачанка аўтары выводзяць з фіна-ўгорскіх «балота», «возера». Ажыўляе тэкст раздзела рамантычная легенда аб прыгажуні Нары, якая, каб не выходзіць замуж за нялюбага, «кінулася ў возера, папоўніўшы яго сваімі слязьмі. Адтуль выцекла рака, якая і сёння дзе павольна, а дзе імкліва бяжыць на сустрэчу з Вяллёй» [4, с. 6]. Дарэчы, гэта не адзіная легенда на старонках кнігі. С. В. Барыс і А. В. Рогач, тлумачачы ўзнікненне той альбо іншай вёскі, часта прыводзяць народныя паданні аб паходжанні яе назвы. Напрыклад, назву вёскі Цынцавічы жыхары звязвалі з мясцовым язычніцкім богам Цінца. «Калі маліліся гэтаму богу, – пішуць аўтары, – жрэц тузаў за шнуркі, і тыя звінелі – выдавалі гукі, падобныя на ціньканне. Ад гэтага і вёска называецца Цынцавічы» [4, с. 415]. Тэкст кнігі перасыпаны вершамі і песнямі пра Нарачанскі рэгіён.

Вялікі раздзел кнігі прысвечаны агляду гістарычных падзей у Вілейска-Нарачанскім краі. Ён ахоплівае перыяд ад сярэдняга каменнага веку да сённяшніх дзён. Найбольш падрабязна пададзена гісторыя Маркаўскага староства (частка земляў, якую вялікі князь за пэўныя заслугі даваў феадалу на часовае карыстанне), у якое ў







РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XV–XIX стст. уваходзіла большасць розных па велічыні населеных пунктаў на берагах Нарачанкі. У розныя часы ёй валодалі такія вядомыя дзяржаўныя дзеячы ВКЛ, як Радзівілы, Забярзінскія, Нарушэвічы, Сапегі, Коцелы, Пацы і інш. Гісторыя староства падаецца ў кантэксце гістарычнага развіцця беларускіх земляў, якія на розных этапах уваходзілі ў склад ВКЛ, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Выкарыстоўваючы метадалогію комплекснага падыходу, краязнаўцы паказваюць гістарычны працэс ва ўзаемасувязі з сацыяльна-эканамічным і культурным развіццём краю.

Апісваючы гісторыю вілейска-нарачанскіх маёнткаў і фальваркаў, аўтары шмат увагі надаюць аналізу тагачаснага культурнага жыцця. Так, пры характарыстыцы фальварка Крыстынопаля вельмі дэталёва распавядаецца пра культуратворчую дзейнасць беларускага пісьменніка Адама Гурыновіча [4, с. 133–139]. Знаёмячыся з гісторыяй маёнткаў Дзевятні [4, с. 160–171] і Равутка, чытач даведаецца аб жыцці і творчасці мастакоў, пісьменнікаў, навукоўцаў Ігната і Леанарда Ходзькаў. На старонках кнігі паўстае вялікая галерэя сусветна знакамітых прадстаўнікоў беларускай культуры, жыццё якіх звязана з Вілейска-Нарачанскай зямлёй: кампазітара, дзяржаўнага дзеяча, асветніка М. К. Агінскага, рускага пісьменніка беларускага паходжання І. К. Кандрацьева, акадэміка М. Н. Маліноўскага, мастака Н. Ю. Сільвановіча, народнага паэта Беларусі Максіма Танка, археолага, пісьменніка М. М. Чарняўскага і інш.

Чытачоў кнігі чакае захапляючае падарожжа па 156 сучасных і былых паселішчах Нарачанскага краю. Яны пазнаёмяцца з яго абрадамі, архітэктурнымі помнікамі, звычаямі, з тысячамі працавітых, таленавітых людзей Нарачаншчыны, якія жылі калісьці і жывуць сёння ў вёсках рэгіёна, што не скарыліся чужынцам, уздымалі з попелу свой край, упрыгожвалі яго.

Працу С. В. Барыса і А. В. Рогача, на наш погляд, па праве можна назваць не толькі краязнаўчай, але і культуралагічнай. Акрамя звестак аб культурным жыцці таго альбо іншага населенага пункта, раскінутых па 700 старонках кнігі, аўтары вылучылі спецыяльны раздзел «Развіццё культуры ў Нарачанскім краі» [4, с. 571–618]. Тут выкладзена гісторыя храмаў, якія функцыянуюць у рэгіёне, утрымліваюцца звесткі пра святароў і іх дзейнасць па фарміраванні духоўнасці ў мясцовых жыхароў. Змешчаны ў кнізе выявы практычна ўсіх храмаў Нарачаншчыны.

С. В. Барыс і А. В. Рогач паэтычна і эмацыянальна апісваюць прастольныя святы храмаў і бліжэйшых да іх вёсак: фэсты на Вадохрышча, Ганну, Дабравешчанне, Міколу, Ілью, Пятро, Спаса, Юр'ю, Яна і інш. Відавочна, што абодва краязнаўцы самі не аднойчы прымалі ўдзел у гэтых фэстах.

Уражвае раздзел, які прысвечаны асвеце і адукацыі рэгіёна. Іх гісторыя, змест і формы асвятляюцца са старажытных часоў – ад існавання царкоўных, арыянскіх, брацкіх, езуіцкіх, піярскіх навучальных устаноў. Асаблівая ўвага нададзена арганізацыі адукацыі ў XIX ст., у пачатку якога ў Расійскай імперыі была праведзена школьная рэформа, што садзейнічала развіццю свецкай адукацыі. З гэтага раздзела мы даведваемся, што для Нарачанскага рэгіёна найбольш распаўсюджанымі былі пачатковыя аднакласныя і двухкласныя народныя вучылішчы, а таксама школы граматы. У параграфе даецца характарыстыка сістэмы адукацыі ў 21 пачатковай школе другой паловы XIX ст. Падрабязна распавядаецца пра сістэму адукацыі ў XX ст. і ў першыя дзесяцігоддзі XXI ст., прыводзяцца статыстычныя звесткі, якія характарызуюць сучасны стан адукацыі на Нарачаншчыне.

Вельмі змястоўныя дадаткі да асноўнага тэксту. Так, «Хроніка важнейшых культурна-гістарычных падзей у Нарачанскім краі» ахоплівае перыяд з XV ст. да 2013 г. «Біяграфічны даведнік» утрымлівае кароткія звесткі пра 87 знакамітых асоб, якія мелі дачыненне да дадзенага рэгіёна. Аматары геральдыкі знойдуць у кнізе апісанне і выявы 32 родавых гербоў землеўладальнікаў Нарачанскага краю. Вельмі карысныя для сучаснага, асабліва маладога, чытача тлумачэнні тэрмінаў і панятцяў, якія ўжываліся ў мінулыя часы.

Такім чынам, кнігу «Нарачанка і яе берагі» С. В. Барыса і А. В. Рогача з поўным правам можна назваць універсальнай энцыклапедыяй Нарачанскага краю. Настаўнікі і вучні знойдуць у ёй каштоўны матэрыял па геаграфіі, гісторыі, літаратуры, грамадазнаўстве, мастацтвазнаўстве, а самае галоўнае, на наш погляд, па эстэтыцы і этыцы. Важная адметнасць сумеснага твора – сакавітая, зразумелая беларуская мова, якой шмат стагоддзяў карысталіся насельнікі гэтага рэгіёна. Кожны радок, кожны сказ гэтага ўнікальнага выдання прасякнуты бязмернай любоўю аўтараў да сваёй малой радзімы і ўдзячнасцю да яе. Заканчваецца кніга пранікнёным зваротам да ракі, якая сфарміравала адметны менталітэт, этас (грэч. – характар), эмпатыю людзей, якія жылі і цяпер жывуць на яе берагах: «Мілая, пяшчотная Нарачанка! Нельга словамі перадаць нашу шчырую любоў да цябе. Нельга нам выказаць стан шчырасці і любові да цябе» [4, с. 617]. У добры шлях, кніга «Нарачанка і яе берагі»! Напісаны з высокай даследчыцкай грунтоўнасцю і шчырай любоўю твор, безумоўна, заслугоўвае ўдумлівага, плённага выкарыстання.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Барыс, С.** Нарочы – 440 гадоў / С. Барыс, М. Кучко // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 8. – С. 71–76.
2. **Барыс, С.** Фэсты ў вёсках і мястэчках Нарачанскага краю / С. Барыс // Краязнаўчая газета. – 2011. – № 34. – верасень.
3. **Барыс, С.** Храмы на Нарачанцы / С. Барыс // Рэгіянальная газета. – 2012. – № 2–11.
4. **Барыс, С. В.** Нарачанка і яе берагі / С. В. Барыс, А. В. Рогач. – Мінск: Зміцер Колас, 2013. – 712 с. [8 л.] іл.
5. **Рогач, А. В.** Прощание с Ганутой / А. В. Рогач // Советская Белоруссия. – 2004. – 23 ноября.
6. **Рогач, А. В.** Зямлёй Вілейшчыны ўзгадваны / А. В. Рогач // Краязнаўчая газета . – 2006. – № 37. – кастрычнік.
7. **Рогач, А. В.** Тайна Бітага Логу / А. В. Рогач // Рэгіянальная газета. – 2008. – № 24. – чэрвень.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ